# І «Рамонкавае поле» ў дапамогу

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Ангеліна з гонарам расказвае, што ў цэнтр прыйшла самастойна, што «мурашачкі» не самая любімая працэдура, што больш за ўсё ей падабаецца «цёпленькі парафін», а самай непрыемнай працэдурай яна лічыць масаж. Дзяўчынка добра ведае, куды ісці і калі. Ёй трэба хадзіць на ўсе лячэбныя мерапрыемствы, прапісаныя ўрачом, і тады, магчыма, яна калі-небудзь апынецца сярод тых удачлівых дзетак, якія ў Рэспубліканскім рэабілітацыйным цэнтры для дзяцей-інвалідаў пазбавіліся афіцыйнага статусу — інвалід. У цэнтры, як паказвае статыстыка, 8—10 дзяцей за год развітаюцца са сваёй хваробай і лічацца з часам здаровымі.

Рэспубліканскі рэабілітацыйны цэнтр для дзяцей-інвалідаў створаны па праграме «Дзеці Беларусі» яшчэ ў 2000 годзе. Тут аказваецца комплексная медыка-сацыяльная рэабілітацыя дзецям-інвалідам ва ўзросце ад 3 да 18 гадоў з захворваннямі нервовай і касцёва-мышачнай сістэм, вынікам якіх з'яўляюцца парушэнні апорна-рухальнага апарату.





— За 20 гадоў дзейнасці цэнтра рэабілітацыю прайшлі каля 23 тысяч дзяцей, — расказвае яго **дырэктар Людміла КАНДРАШОВА.** — За апошнія 5 гадоў нам удалося зняць інваліднасць у 62 дзяцей. Толькі ў першым паўгоддзі бягучага года — у трох малых. У нашым цэнтры дзеці не проста праходзяць медыцынскую рэабілітацыю — яны пражываюць сваё жыццё разам з намі на працягу 4—6 тыдняў. Адны жывуць у нашай гасцініцы, хтосьці прыходзіць на працэдуры стацыянарна, з некаторымі мы працуем дыстанцыйна. Мы вучым дзяцей навыкам самаабслугоўвання: трымаць у руках лыжку, відэлец, кубак... З намі дзеці пачынаюць гаварыць першыя словы. Цэнтр ажыццяўляе не толькі медыцынскую рэабілітацыю, але аказвае і педагагічную, і сацыяльна-псіхалагічную дапамогу.

Пяцігадовы Яраслаў, у адрозненне ад Ангеліны, любіць усе працэдуры. Ён задаволена шчабеча пасля прыняцця лячэбнай ванны.

Напярэдзе хлопчыка чакае няпростая аперацыя на тазасцегнавых суставах, потым — зноў рэабілітацыя, і калі ўсё пройдзе ўдала, малога паўторна прааперыруюць, у выніку апошняя аперацыя павінна даволі сур'ёзна палепшыць яго стан. Мама, Вольга Бярэзіна, робіць усё магчымае, каб яе сын адчуваў сябе лепш. Каб трапіць на чарговую рэабілітацыю ў цэнтр, яна ўзяла водпуск на рабоце. Яе адпачынак — рэабілітацыя і дапамога сыну.

— Калі я працавала ўрачом, то даволі хутка бачыла вынікі сваёй працы, — расказвае Людміла Кандрашова. — Тут усё інакш. Хуткага выніку можа і не быць, але можна назіраць, як на працягу гадоў мяняецца дзіця і яго бацькі. Часта маці і дзіця ў нас — гэта як бы тандэм. Бацькі дзяцей з інваліднасцю быццам дапамагаюць пражыць свайму дзіцяці яго жыццё. Таму персанал і спецыялісты ў нас падабраны так, каб не толькі лячыць дзіцячае цела, але і падтрымліваць бацькоў — прафесійнымі кансультацыямі, добрым словам і клапатлівым стаўленнем.

**Уся дапамога ў цэнтры аказваецца бясплатна. Між тым адзін 6-тыднёвы курс рэабілітацыі каштуе дзяржаве каля 2 тысяч долараў на чалавека.**

Аляксей Кусін прывёз сваю дзевяцігадовую дачку Марыю на чарговую рэабілітацыю перад вучэбным годам. Першы раз яна аказалася тут, калі была зусім малечай. Бацькі тады адразу адчулі палёгку — раней ім прыходзілася ездзіць па паліклініках і шукаць патрэбныя працэдуры. Тут жа ўсе спецыялісты ў адным месцы, яны ведаюць, што рабіць і як. Нават час рэабілітацыі падбіраюць індывідуальна, пад кожнае дзіця. Так, Маша будзе наведваць школу, а пасля ўрокаў прыходзіць на працэдуры. А вось аднакласнік Мацвей не мінчанін, таму ў школу ён пойдзе ў цэнтры. З татам, Віталем Круковічам, яны засяліліся ў гасцініцу «Рамонкавае поле» на час рэабілітацыі. Дарэчы, днямі адбылося ўрачыстае мерапрыемства з нагоды мадэрнізацыі гасцініцы, якое наведала **міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына КАСЦЕВІЧ.**

«Гасцініца прызначана для сумеснага пражывання 41 дзіцяці і іх бацькоў. Гэта важна для дзетак малодшага ўзросту, якія маюць патрэбу ў дадатковым доглядзе. Малыя адчуваюць роднага чалавека і хутчэй адаптуюцца. Важна, каб і ім, і іх бацькам было камфортна», — патлумачыла міністр рашэнне абнавіць гасцініцу.

Бацька Мацвея вельмі задаволены ўмовамі пражывання і тым, што сын не прапусціць урокі.

— У цэнтры арганізаваны навучальны працэс як у школе, і першага верасня для вучняў празвініць першы званок, — расказвае дырэктар цэнтра. — Настаўнікі прыходзяць і праводзяць паўнавартасныя ўрокі. Некаторых дзяцей, калі гэта неабходна, дэфектологі цэнтра суправаджаюць на школьныя заняткі. Таму, прыязджаючы ў цэнтр, малое нічога не страчвае ні ў здароўі, ні ў адукацыі, ні ў зносінах з іншымі дзецьмі.

Пяцігадовы Ілья замкнуўся ў сабе, як толькі зразумеў, што яму нельга бегаць. Здавалася, яшчэ нядаўна ён наведваў дзіцячы садок, і жыццё было радасным і бесклапотным, а цяпер — паходы да ўрачоў, бальніцы... Калі Ілья стаў кульгаць, яго мама звярнулася да спецыялістаў. Аказалася, у малога хвароба Пертэса, Ілью далі інваліднасць, і ў сакавіку ён папоўніў базу рэабілітацыйнага цэнтра. Сёння ў спісе каля 2700 дзяцей. Кожныя паўгода камітэты працы і сацабароны дасылаюць інфармацыю ў цэнтр аб новых малых, якія атрымалі інваліднасць. Дзеці, якія ёсць у базе, усе па чарзе праходзяць рэабілітацыю ў цэнтры па складзеных урачамі графіках.

Дзяцей ва ўзросце ад трох да васямнаццаці гадоў запрашаюць на рэабілітацыю. Бывае, што адно малое можа за гэтыя некалькі гадоў пабываць у цэнтры больш за 20 разоў. Натуральна, што тут яны знаходзяць сабе сяброў. Хлопчыкі і дзяўчынкі, пасябраваўшы, дамаўляюцца прыязджаць на рэабілітацыю ў адзін і той жа час. Дарослыя ідуць насустрач і распрацоўваюць графікі так, каб сябры мелі магчымасць сустрэцца. Ужо ў падлеткавым узросце дзецям дапамагаюць знайсці прафесію, у якой яны могуць сябе рэалізаваць.

**Прыязджаючы ў цэнтр, малое нічога не страчвае ні ў здароўі, ні ў адукацыі, ні ў зносінах з іншымі дзецьмі.**

— Для аказання прафарыентацыйнай дапамогі выпускнікам цэнтр заключыў пагадненне з РНПЦ медыцынскай экспертызы і рэабілітацыі аб узаемным супрацоўніцтве, — расказвае Людміла Кандрашова. — Спецыялісты РНПЦ праводзяць кансультацыі з дзіцем. Цяпер сярод нашых выпускнікоў можна сустрэць урачоў, педагогаў, бібліятэкараў, работнікаў метэастанцый і IT-сферы. Гэта цудоўныя вынікі. Раней нашы дзеці маглі атрымаць толькі пэўныя прафесіі, а цяпер падлеткі маюць магчымасць паступаць у вышэйшыя навучальныя ўстановы, што раней было недасяжальна. Я з гонарам магу сказаць, што ў нашым цэнтры працуюць два нашы выхаванцы.



Адна дзяўчынка — інструктар па працатэрапіі і выкладчык англійскай мовы, а другая — інструктар па гуртковай дзейнасці. Хто, як не яны, могуць матываваць нашых дзяцей і іх бацькоў?! Яны прыклад таго, што ў жыцці няма нічога немагчымага, а інваліднасць — не прысуд.

Уся дапамога ў цэнтры аказваецца бясплатна. Між тым адзін 6-тыднёвы курс рэабілітацыі каштуе дзяржаве каля дзюх тысяч долараў на чалавека. База тых, хто мае патрэбу ў рэабілітацыі, пастаянна актуалізуецца, а «навічкам» супрацоўнікі цэнтра тэлефануюць і запрашаюць да сябе. Так маці Ільюшы, Алесі Заяц, паведамілі аб магчымасці прайсці рэабілітацыю.

— Калі мы даведаліся аб хваробе сына, было вельмі цяжка, — прызнаецца жанчына. — Памятаю, як літаральна хадзіла і выбівала пуцёўку ў санаторый, каб неяк дапамагчы Ілы. Таму было нечаканасцю, калі мне патэлефанавалі з цэнтра і запрасілі на рэабілітацыю. У Ільі тут з'явіўся апетыт, ён ажывіўся і знайшоў сабе сяброў. Нядаўна заявіў, што, мабыць, і пасядзеў бы тут годзік *(смяецца)*. Мы атрымліваем дапамогу не толькі для паляпшэння фізічнага стану дзіцяці. Дэфектолаг, напрыклад, стаў праводзіць заняткі з маім сынам, і ўжо сёння малы выхваляўся тым, як навучыўся гаварыць літару «Р». Але самае каштоўнае, што Ілья ўбачыў: ён не адзін такі, так бывае, дзеці хварэюць. Мы ж з бацькамі маем магчымасць падтрымліваць адно аднаго. Гэта дарагога варта.

— У нас да рэабілітацыі дзяцей ставяцца комплексна, — гаворыць Людміла Кандрашова. — Нашы ўрачы і педагогі пастаянна ўдасканальваюць свае веды, распрацоўваюць новыя методыкі рэабілітацыі. Мы адкрытыя для валанцёраў, якія прыходзяць да нас дапамагаць, а гэта і студэнты, і актывісты розных арганізацый. Разам мы становімся лепшымі і мяняем стаўленне грамадства да дзяцей-інвалідаў. А тое, што дзяржава робіць для падтрымкі нашых падапечных, каштоўна. І нягледзячы на складаныя абставіны ў краіне з каранавірусам, мы не адчулі на сабе ні на кроплю зніжэння ўзроўню ўвагі, ні на капейку наша фінансаванне не скарацілася. Дзеці засталіся ў цэнтры ўвагі, а так і павінна быць.

**Фота аўтара.**

Актыўнае даўгалецце

## МУДРАСЦЬ, ВОПЫТ І БЯСПЕКА

**Адбыўся фінал І Рэспубліканскага конкурсу для пажылых людзей «Мудрасць. Вопыт. Бяспека», які праходзіў у Барысаўскім раёне на базе філіяла Інстытута перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі Універсітэта грамадзянскай абароны МНС Беларусі.**

Увесь ліпень праходзіў абласны этап, які ўключаў правядзенне адборачных раённых спаборніцтваў. У выніку сем каманд (ад кожнай вобласці і горада Мінска) сустрэліся, каб на працягу трох дзён вызначыцца, хто стане пераможцам конкурсу.

Праграма спаборніцтваў спалучала творчыя конкурсы, вікторыны і экстрэмальныя эстафеты, дзе пажылыя людзі змагаліся з агнём. Удзельнікі паказалі на сваім прыкладзе, наколькі важна весці здаровы лад жыцця. Яны на практыцы фарміравалі правілы паводзінаў у экстранных сітуацыях: рабілі рабочую лінію для падачы вады да месца пажару, эвакуіравалі «пацярпелых» у бяспечную зону з дапамогай «нацяжных ратавальных палотнаў», ратавалі тапельцаў.

Падчас спаборніцтваў каманды прадэманстравалі веданне асноўных правілаў пажарнай бяспекі, прылад аўтаномных пажарных апавяшчальнікаў, вогнетушыцеляў, уменне выяўляць парушэнні правілаў пажарнай бяспекі ў дамах.

Першае месца заваявала каманда Віцебскай вобласці «Аптымісты», другое — каманда Гомельскай вобласці «Агенты 112», трэцяе — каманда Гродзенскай вобласці «СОС».

— Усе каманды арыгінальныя, крэатыўныя і артыстычныя, — сказаў падчас узнагароджання пераможцаў **намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Іван ЛАЎРЫНОВІЧ.** — Уражаны ўдзельнікамі і самім конкурсам. Упэўнены, што конкурс для пажылых людзей «Мудрасць. Вопыт. Бяспека» стане добрай традыцыяй на доўгія гады.

**Матэрыялы падрыхтавала Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**